*І.І.БАМБЕШКА*

# З ГІСТОРЫІ СТВАРЭННЯ І ДЗЕЙНАСЦІ ПЕРШАГА ГРАМАДСКАГА КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ Ў БЕЛАРУСІ

Адной з найбольш значных з'яў культурнага жыцця міжваенных дзесяцігоддзяў XX ст. быў краязнаўчы рух, які разгарнуўся адразу пасля рэвалюцыйных падзей у кастрычніку 1917 г. Першыя краязнаўчыя суполкі ўзніклі ўжо ў 1918–1920 гг.: Смялярскі гурток радзімазнаўства ў Ігуменскім павеце (1918–1921), Слуцкае культурна-асветніцкае таварыства "Папараць-кветка" (1918–1921), гурток па вывучэнні Гомельшчыны (1923–1925) і інш. Паступова пачалі ўзнікаць і іншыя асяродкі па вывучэнні роднага краю. На час правядзення І Усебеларускага краязнаўчага з'езда (люты 1926 г.) у Беларусі налічвалася 167 розных краязнаўчых арганізацый [12, с. 16].

Значнай падзеяй у працэсе кансалідацыі намаганняў беларускіх краязнаўцаў было стварэнне 29 снежня 1923 г. Цэнтральнага бюро краязнаўства (ЦБК). У сакавіку 1924 г. адбылася Мінская краязнаўчая канферэнцыя, праз некалькі месяцаў, у лістападзе таго ж года, – І Усебе-ларуская. На ёй былі распрацаваны метады каардынацыі краязнаўчай работы ў межах рэспублікі, а таксама вырашана выдаваць спецыяльны краязнаўчы часопіс. У канцы 1924 г. адбылася рэарганізацыя Інстытута беларускай культуры (ІБК), якая выклікала змены ў складзе ЦБК. 21 лютага 1925 г. на агульным сходзе ІБК быў абраны новы склад галоўнага краязнаўчага органа. У пачатку 1926 г. для падвядзення вынікаў першых гадоў працы краязнаўчых арганізацый у Беларусі быў праведзены І Усебеларускі краязнаўчы з'езд. Адна са шматлікіх пастаноў з'езда тычылася менавіта музейнага будаўніцтва. Згодна рэзалюцыі №4 кожная краязнаўчая суполка павінна была арганізаваць музей, які адлюстроўваў бы ў сваёй экспазіцыі прыроду, гаспадарку і быт пэўнага рэгіёну. Рэзалюцыя, акрамя таго, тычылася і фінансавання музеяў. Акруговыя музеі ўтрымліваліся за кошт бюджэту акругі, а "калі музей не атрымоўваў сродкаў па мясцовым бюджэце, дык яны змяшчаліся альбо пры мясцовым краязнаўчым таварыстве, альбо пры адной з мясцовых культурных устаноў" [9, с. 83]. У першым нумары краязнаўчага часопіса "Наш край" быў надрукаваны прыкладны статут краязнаўчага таварыства, адзін з пунктаў якога вызначаў у якасці напрамку дзейнасці арганізацыю ўласнага музея [8, с. 38]. Увогуле трэба адзначыць, што ЦБК шмат увагі надавала каардынацыі музейнай дзейнасці ў межах краязнаўчых таварыстваў. Пытанні музеебудаўніцтва абмяркоўваліся на краязнаўчых з'ездах і канферэнцыях, на старонках галоўнага краязнаўчага часопіса "Наш край" змяшчаліся артыкулы на адпаведную тэматыку.

Першым у шырокай сетцы краязнаўчых музеяў быў Слуцкі акруговы краязнаўчы музей. Ужо ў 1921 г., калі быў створаны Слуцкі павятовы аддзел народнай асветы, А.Ю.Бараноўскаму, аднаму з сяброў гэтай арганізацыі, было даручана распачаць працу па збіранні прадметаў музейнага значэння. Для іх было нават адведзена месца ў будынку былой гімназіі, а самому А.Ю.Бараноўскаму быў вызначаны заробак па стаўцы настаўніка [13, с. 62].

Больш актыўна праца па стварэнні музея пачала разгортвацца са снежня 1922 г., калі ў Слуцкі аддзел народнай адукацыі інспектарам сацыяльнага выхавання быў прызначаны М.Каспяровіч. У верасні 1922 г. (па іншых даных – у снежні 1922 г.) пры Слуцкім аддзеле народнай адукацыі была створана Слуцкая павятовая камісія беларусазнаўства. Яна павінна была распрацоўваць вялікае кола пытанняў краязнаўчага кшталту, у тым ліку і музейнага будаўніцтва. Планавалася арганізаваць Слуцкі музей радзімазнаўства, а таксама стварыць сетку школьных музеяў аналагічнага профілю. Слуцкі акруговы музей павінен быў складацца з трох аддзелаў: педагагічнага, этнаграфічнага і прамысловага. Апошні аддзел, меркавалася, павінен быў уключаць некалькі пададдзелаў: сельскагаспадарчы, тэхнічны і кустарна-мастацкі і інш.

Для рэалізацыі гэтага праекта было створана спецыяльнае музейнае бюро ў складзе Барташэвіча, А.Ю.Бараноўскага, Яновіча і старшыні Якімава, якое і прыступіла да збору прадметаў [11, с. 164].

Акрамя збірання прадметаў музейнага значэння, музейнае бюро асаблівую ўвагу надавала ахове помнікаў старажытнасці і мастацтва. Былі нават распрацаваны спецыяльныя анкеты з мэтай іх выяўлення, якія рассылаліся па акрузе, а таксама зроблены пэўныя захады па іх ахове. Аднак асноўная ўвага сяброў музейнага бюро была скіравана на камплектаванне фондаў будучага музея. Менавіта для гэтай мэты камісія беларусазнаўства арганізавала шэраг экспедыцый, у якіх прынялі ўдзел і сябры музейнага бюро. Падчас экспедыцый праводзіўся збор матэрыялу, запісваўся

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фальклор, рабіліся фотаздымкі краявідаў і мясцовых жыхароў. Асабліва багатыя вынікі дала праведзеная ўлетку 1923 г. экспедыцыя для зарысоўвання народных арнаментаў, якіх было зроблена звыш 3000. Акрамя таго, сярод сабранага былі цікавыя ўзоры народнага адзення, тканіны, прылады працы. Гэтыя матэрыялы былі пакладзены ў аснову павятовай сельскагаспадарчай выставы з асобным этнаграфічным аддзелам, якая адбылася 26 і 27 чэрвеня 1923 г. [1]. Такія выставы ладзіліся ўлетку 1923 г. скрозь па Беларусі, паколькі ішла падрыхтоўка да I Усесаюзнай сельскагаспадарчай і саматужна-прамысловай выстаўкі з замежным аддзелам, што адбылася ў Маскве з 15 жніўня па 15 лістапада 1923 г. Дарэчы, за працу па зборы і дастаўцы прадметаў на гэтую выстаўку інспектар сацыяльнага выхавання Слуцкага аддзела народнай адукацыі М.Каспяровіч быў узнагароджаны прэміяй і атрымаў у якасці ўзнагароды 30 пудоў жыта [15, с. 59]. Пасля закрыцця павятовай выстаўкі частка прадметаў увайшла ў склад экспазіцыі беларускага павільёна на I Усесаюзнай сельскагаспадарчай і саматужна-прамысловай выставе [14, с. 62]. Астатняе з сабранага было перавезена ў будынак Слуцкай царквы-брамы, які да 1926 г. выкарыстоўваўся ў якасці фондасховішча.

На жаль, рэарганізацыя камісіі беларусазнаўства ў навукова-даследчую арганізацыю – Слуцкае павятовае таварыства краязнаўства, якое павінна было займацца ў тым ліку і пытаннямі ўладкавання музея, не спрыяла зменам у лепшы бок у музейным жыцці Слуцка. Праца па арганізацыі музея амаль спынілася, хоць фарміраванне музейных калекцый усё ж такі працягвалася: збіраліся матэрыялы мастацкага і гістарычнага характару, таксама была ўтворана бібліятэка пры музеі, у якую трапілі кнігі, што ўяўлялі, на думку збіральнікаў, гістарычную каштоўнасць, і старадрукі. Аднак гэты, і без таго вельмі павольны, працэс фарміравання фондаў музея суправаджаўся і значнымі стратамі. Справа ў тым, што яшчэ 19 лістапада 1924 г. была прынята пастанова СНК БССР “Аб канцэнтрацыі мастацкіх і гісторыка-культурных каштоўнасцей” [14]. Згодна з гэтай пастановай у Беларускі дзяржаўны музей (г. Мінск) былі перададзены найбольш каштоўныя помнікі са Слуцкага музея (і не толькі). Так, былі перададзены партрэты слуцкіх князёў Алелькавічаў, рукапіснае евангелле XVI ст., епітрахіль і посах XVI ст., сярэбраная рыза таго ж стагоддзя, малюнкі вядомага мастака Катарбінскага [7, с. 28]. Праўда, па некаторых звестках гэтыя прадметы трапілі ў Беларускі дзяржаўны музей толькі ў 1927 г. [3, с. 50, 51]. Пасля гэтых перадач у Слуцкім музеі засталіся толькі другарадныя рэчы (каля 200 рэчавых помнікаў і каля 560 кніг у бібліятэцы). Акрамя таго, нават у гэты не вельмі спрыяльны час дзякуючы намаганням сяброў музейнай секцыі, былі заснаваны валасныя радзімазнаўчыя музеі, найбольш вядомыя сярод якіх былі музеі ў Грозаве і Леніне [13, с. 57].

Пасля двухгадовага перапынку, 22 лістапада 1925 г. быў, нарэшце, зацверджаны акруговы выканаўчы камітэт краязнаўства і прыняты статут акруговага таварыства. Гэтыя змены станоўча паўплывалі на жыццё Слуцкага музея. У складзе акруговага таварыства была ўтворана спецыяльная музейная секцыя, у якую ў 1925–1926 гг. уваходзілі аж 32 сябры. На другім агульным сходзе акруговага таварыства быў зачытаны спецыяльны даклад на выключна музейную тэматыку. Дакладчык прапаноўваў будаваць музей на аснове трох аддзелаў: культурна-гістарычнага, прыродна-гістарычнага і грамадска-эканамічнага.

У абавязкі секцыі, якія былі вызначаны на сходзе, уваходзілі:

1) распрацоўка пытанняў камплектавання фондаў музея;

2) фарміраванне сістэмы ўліковай дакументацыі і складанне каталогаў;

3) вывучэнне музейных прадметаў (сябрамі не толькі музейнай секцыі, але і ўсяго таварыства);

4) фарміраванне музейнага архіва, у якім павінна была збірацца дакументацыя, звязаная з дзейнасцю музейнай секцыі і самога музея;

5) складанне бібліяграфічных звестак па Случчыне.

1926 г. быў вельмі эфектыўны ў працы музейнай секцыі. Галоўнай праблемай для музея заставалася адсутнасць уласнага памяшкання, шмат намаганняў было патрачана, каб дабіцца выдзялення для музея ў Доме культуры некалькіх пакояў [4, с. 76]. Па-ранейшаму клапаціліся супрацоўнікі секцыі і пра фарміраванне фондаў музея. Была распрацавана адозва да ўсіх партыйных, савецкіх і грамадскіх устаноў, а таксама простых грамадзян Слуцкай акругі аб зборы і ахвяраванні музею рэчаў. Важна, што інтарэсы музея былі скіраваны не толькі на збор прадметаў даўніны. Супрацоўнікі вельмі актыўна ўзяліся за працэс камплектавання прадметаў сучаснасці, былі пасланы пісьмы ў розныя ўстановы з пералікам неабходных музею матэрыялаў, якія б адлюстроўвалі розныя бакі дзейнасці тых ці іншых устаноў і арганізацый. Супрацоўнікі музея на працягу 1926 г. вялі апрацоўку гербарыяў, прыводзілі ў належны стан бібліятэку, тым больш, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музею была перададзена бібліятэка Кальвінскага збору (каля 400 кніг разам са знакамітай Кальвінскай бібліяй). У выніку такой напружанай працы за год збор музея ўзбагаціўся значнай колькасцю прадметаў, павялічыўся, натуральна, і бібліятэчны фонд. Як вынік сваёй дзейнасці на працягу года супрацоўнікі арганізавалі выставу з апрацаваных і часткова апрацаваных прадметаў. Яна адкрылася 26 кастрычніка 1926 г. Акрамя таго, супрацоўнікі музейнай секцыі працягвалі працу па заснаванні радзімазнаўчых музеяў у іншых месцах Слуцкай акругі (Капылі, Любані, Старых Дарогах і Старобіне) [13, с. 73].

Наступны, 1927, год азнаменаваўся вельмі значнай падзеяй у жыцці Слуцкага акруговага музея: 28 сакавіка 1927 г. была адкрыта новая экспазіцыя. Адкрыццё было прымеркавана да пачатку працы акруговага з'езда Саветаў. З гэтага моманту музей пачынае працаваць рэгулярна. Пазнаёміцца з экспазіцыяй можна было два разы ў тыдзень.

Экспазіцыя музея складалася з трох аддзелаў, як і меркавалася ў 1925 г.

1. Культурна-гістарычны аддзел утрымліваў археалагічныя (неалітычныя малаткі і цёслы, знойдзеныя ў курганах чарапы, косці, гаршкі, шкляныя вырабы і інш.) і нумізматычныя помнікі, узоры зброі і вайсковага рыштунку, план Слуцка 1780 г., палову слуцкага пояса XVIII ст. з надпісам "Лео Маджарскі в граде Слуцке" і інш.

2. Прыродна-геаграфічны аддзел складалі калекцыі разнастайных карт (тапаграфічныя і глебавыя трохверставыя карты Слуцкай акругі, планы гарадоў і інш.), алейныя малюнкі пейзажаў Случчыны, фотаздымкі палескіх тыпаў, чучалы дзіка, сусла, пацука, крата, калекцыі матылькоў, мясцовых раслін, мінералаў.

3. Грамадска-эканамічны аддзел утрымліваў альбом тканін, снапкі збожжа гаспадароў, якія былі ўзнагароджаны на павятовай выстаўцы 1923 г., вырабы народнай творчасці, мадэлі маста і бараны, карту эканамічнай сеткі Слуцкай акругі, калекцыю па ахове здароўя [7, с. 29].

У 1927 г. працягвалася камплектаванне фондаў музея. Спосабамі папаўнення музейных калекцый былі разнастайныя экскурсіі (батанічныя, геалагічныя і дэндралагічныя), экспедыцыі (больш за сотню прадметаў рознага характару было прывезена з экспедыцыі на Князь-возера, якую ладзіла Слуцкае акруговае таварыства краязнаўства ў ліпені 1927 г.), праца з асобнымі грамадзянамі (напрыклад, у настаўніка з Цімкавіч была набыта калекцыя чучал птушак) і арганізацыямі (у музей трапілі матэрыялы ліквідаванага акруговага статыстычнага камітэта). Такім чынам, за 1927 г. фонд музея папоўніўся 760 самымі рознымі рэчамі. Акрамя таго, у музейную бібліятэку паступілі 144 тамы кніг [13, с. 76].

Ліквідацыя Слуцкай акругі ў канцы 1927 г., якая адбылася ў выніку змен у адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленні БССР, адмоўным чынам адбілася на жыцці Слуцкага акруговага таварыства краязнаўства. Па-першае, таварыства страціла каля 75% сваіх сяброў, а па-другое, яно апынулася ў вельмі складанай фінансавай сітуацыі. 25 верасня 1927 г. адбылася рэарганізацыя Слуцкага акруговага таварыства краязнаўства ў раённа-гарадское. Такія абставіны, канешне, не спрыялі развіццю музея, і з канца 1927 г. у музеі пачынаецца застой. У адной са справаздач таварыства адзначаецца, што "музей паступова страчвае сваё значэнне, набыўшы характар кладоўкі для складвання рэчаў" з-за адсутнасці памяшкання [2, с. 88–89]. Аднак, нават нягледзячы на такія неспрыяльныя ўмовы, музей працягваў папаўняць свае калекцыі. У той жа справаздачы гаворыцца, што за пяць месяцаў 1928 г. была набыта значная колькасць матэрыялаў як прыродна-геаграфічнага характару, так і грамадска-эканамічнага, у тым ліку 11 рыбалоў-ных прылад, якія ўжываюцца рыбакамі на Князь-возеры, мадэлі ткацкіх прылад і інш. На канец 1928 г. агульная колькасць прадметаў музейнага фонду складала 1766 адзінак. Акрамя камплектавання музейнага фонду, у музеі праводзіліся і навуковая апрацоўка прадметаў (калекцыі манет і фота-матэрыялаў), фотафіксацыя гістарычных і прыродных помнікаў. Гэта было магчыма, паколькі ў 1927/28 акадэмічным годзе музейная секцыя атрымала ад слуцкіх гарадскіх улад 300 рублёў на ўтрыманне музея.

Як адзначалася, пры музеі існавала бібліятэка, у якой утрымліваліся кнігі 1334 назваў. Сярод іх былі археаграфічныя зборнікі старажытных грамат, падручнікі па краязнаўстве, кнігі агульнагеаграфічнага характару і на гістарычную тэматыку, рукапісныя кнігі і рукапісы.

Аднак сітуацыя так і не палепшылася. Кардынальныя змены ў культурным развіцці супалі з распаўсюджваннем тэндэнцыі раскрыцця нацыяналізму ў розных сферах грамадскага жыцця, у тым ліку і краязнаўстве. Былі разгромлены краязнаўчыя арганізацыі разам з музеямі ў шматлікіх гарадах Беларусі. Ледзь трывалася і Слуцкае раённа-гарадское таварыства краязнаўства. У 1938 г. Слуцкі музей быў закрыты. Лёс калекцый музея невядомы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падводзячы вынікі, можна адзначыць, што першы ў Беларусі грамадскі краязнаўчы музей, які быў створаны ў самым пачатку 1920-х гадоў, дзейнічаў амаль два дзесяцігоддзі. Гэта была сапраўдная музейная ўстанова: існавалі своеасаблівая канцэпцыя камплектавання, багатая экспазіцыя, якая адлюстроўвала разнастайныя бакі мінулага і сённяшняга жыцця Случчыны, праводзіліся вывучэнне калекцый і іх папулярызацыя праз экскурсійную і лекцыйную дзейнасць. Аднак змены ў жыцці краіны не спрыялі развіццю музея.

1. *Абгляд* экспанатаў на ўсерасійскую сельскагаспадарчую выстаўку // Савецкая Беларусь. – 1923. – 4 ліп.

2. *Аб дзейнасці* Слуцкага раённа-гарадскога краязнаўчага таварыства за 5 месяцаў 1928 г. // Наш край. – 1928. – № 6–7. – С. 88–89.

3. *Белорусский* государственный музей // Белорусская культура. – 1928. – Сб. 1. – С. 49–54.

4. *Дасягненні* Слуцкага таварыства // Наш край. – 1926. – № 10-11. – С.75–76.

5. *Каспяровіч М.* Краязнаўства. – Мн.: Белдзяржвыдавецтва, 1929. – 62 с.

6. *Лісаў А.Г., Падліпскі А.М.* Краязнавец Мікалай Каспяровіч. – Віцебск: УПП “Віцебская абласная друкарня”, 2000. – 46 с.

7. *Мікіцікі У.* Слуцкі раённы краязнаўчы музей // Наш край. – 1928. – №1.

8. *Наш край.* – 1925. – №1.

9. *Наш край.* – 1926. – № 2-3 (5-6).

10. *Полымя.* – 1925. – №1.

11. *Полымя.* – 1923. – № 5-6.

12. *Працы* Першага ўсебеларускага краязнаўчага зьезда. 7–11 лютага 1926 г. – Мн.: Інбелкульт, 1926. – 81 с.

13. *Пяцэвіч Р., Мікіцікі У., Ажэўскі П.* Краязнаўчы рух на Случчыне // Наш край. – 1928. – №12. – С. 62–78.

14. *Собрание* узаконений и распоряжений рабоче-крестьянского правительства БССР. – 1925. – № 7.

15. *ЦНА НАНБ.* Ф. 67, воп. 1, спр. 7, арк. 59.

16. *ЦНА НАНБ.* Ф. 67, воп. 1, спр. 9, акр. 75.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ